**А. Г. Цымбал**

# "НОВЫ АГРАРНЫ ПАРАДАК" У АКУПАВАНАЙ БЕЛАРУСІ (1941–1944) ПАВОДЛЕ ГЕРМАНСКІХ ТРАФЕЙНЫХ ДАКУМЕНТАЎ НАРБ*

Статья посвящена изучению информационного потенциала документов Хозяйственной инспекции группы армий «Центр» (фонд 412 Национального архива Республики Беларусь). Документы германских оккупационных структур представляют собой исключительный по значимости и малоисследованный комплекс, который содержит богатый фактический материал относительно повседневной жизни и экономического положения сельского населения Беларуси периода германской оккупации.

Трафейныя дакументы германскага паходжання, што захоўваюцца ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь, маюць выключную значнасць для аналізу палітыкі, практыкі і наступстваў нацысцкага эканамічнага генацыду на акупаванай тэрыторыі Беларусі. Палітыку акупантаў адносна сельскай гаспадаркі і сельскіх жыхароў, у першую чаргу ўсходняй частцы Беларусі, раскрываюць крыніцы фонду 412 НАРБ (Гаспадарчая інспекцыя групы армій "Цэнтр").

Матэрыялы гэтага фонду змяшчаюць пастановы, дырэктывы, загады, распараджэнні, цыркуляры, інструкцыі гаспадарчага штаба "Остланд", гаспадарчай інспекцыі і гаспадарчага кіраўніка пры Галоўным ваенным камандаванні групы армій "Цэнтр". Сярод дакументальнай спадчыны акупацыйных гаспадарчых структур знаходзяцца справаздачы, статыстычныя дадзеныя, перапіска аб стане і развіцці тэкстыльнай прамысловасці, ходзе аднаўлення і рабоце тарфяных заводаў, папяровых фабрык і прадпрыемстваў тэкстыльнай прамысловасці, забеспячэнні іх сыравінай і палівам, выкананні вытворчай праграмы, памерах ворных і лугавых земляў па раёнах Беларусі, пасевах азімых, яравых і тэхнічных культур, стане саўгасаў і колькасці працоўнай сілы ў калгасах. Сярод дакументаў утрымліваюцца карткі вытворчых магутнасцей і спісы дзеючых прадпрыемстваў, а таксама ўказы, інструкцыі і іншыя дакументы адносна арганізацыі эксплуатацыі рэсурсаў акупаванай Беларусі ў галіне сельскай гаспадаркі і выкарыстанні працы беларускага сельскага насельніцтва [1]. Дадзеныя крыніцы прадстаўляюць вялікі масіў факталагічнай інфармацыі, якая істотна ўзбагачае ўяўленні гістарычнай навукі аб перыядзе нацысцкай акупацыі Беларусі, ажыццяўленні палітыкі генацыду і выкарыстанні працы мясцовага насельніцтва. Акрамя таго, масіў дакументаў пралівае святло на ўмовы жыцця сельскага насельніцтва, працоўную штодзённасць і магчымасці выжывання ва ўмовах акупацыі.

*Арганізацыя землекарыстання і кіравання сельскай гаспадаркай ва ўмовах акупацыі*

*Артыкул падрыхтаваны пры фінансавай падтрымцы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Трафейныя германскія дакументальныя матэрыялы даюць прадстаўленне аб шматлікіх аспектах арганізацыі кіравання аграрным сектарам і яго трансфармацыі здзейсненай акупацыйнымі ўладамі. Яны, сутыкнуўшыся з правалам «маланкавай вайны», былі вымушаны пераходзіць да вырашэння задачы доўгатэрміновага выкарыстання рэсурсаў Беларусі, у тым ліку сельскай гаспадаркі, якая адыгрывала значную ролю ў забеспячэнні харчаваннем вермахта і адміністрацыйнага апарату.

Адным з першых акупацыйнымі ўладамі было выдадзена распараджэнне аб стварэнні нямецкага сельскагаспадарчага ўпраўлення ад 14 лістапада 1941 г. Згодна з інструкцыяй ствараліся сельскагаспадарчая адміністрацыя розных узроўняў. Характэрна, што ў дакуменце адзначалася неабходнасць шырокага выкарыстання працы мясцовых работнікаў [2, арк. 35].

Было распрацавана часовае палажэнне аб землекарыстанні для Генеральнага камісарыята Беларусі, якое павінна было набыць сілу з 1 лютага 1942 г. [3, арк. 47] Палажэнне абумоўлівала асноўныя падыходы нацыстаў да кіравання аграрным сектарам эканомікі. Дакумент складаўся з 16 пунктаў, якія здымалі абавязковую калектыўную апрацоўку зямлі. Сельскія гаспадаркі пасля аднагалоснага рашэння членаў калгаса і адпаведнага зацвярджэння атрымалі права перайсці да індывідуальнага карыстання зямлёй. Любы самавольны падзел калгасаў забараняўся. Тым не менш акупацыйныя ўлады вырашылі захаваць калгасную сістэму. Усе калгасы, якія існавалі да 1942 г., павінны былі аднавіцца і захавацца ў дзяржаўнай уласнасці.

Калгаснікі, што працавалі ў гаспадарцы па стане на 22 чэрвеня 1941 г., атрымлівалі права на зямельную долю. Таксама прадугледжвалася стварэнне фермерскіх гаспадарак. Неабходнай абвяшчалася ліквідацыя зямельнага рэзерву, каб даць магчымасць засяліць фермераў. Кожны фермер павінен быў атрымаць у сярэднім 6–8 гектараў ворнай зямлі і лугу. Пры перавышэнні гэтых памераў неабходна было атрымаць спецыяльнае адабрэнне адказнага раённага кіраўніцтва.

Вызначалася неабходнасць размеркавання палёў і лугоў, пашы і адкрытых угоддзяў, якія заставаліся ў карыстанні. Пры падзеле поля неабходна было захоўваць севазварот і магчымасць яго сумеснай апрацоўкі. Памежныя палосы ўзнікаць не павінны. Усе сяляне ў вёсцы былі абавязаны разам араць і несці салідарную адказнасць за стоадсоткавую замову, а таксама за стопрацэнтнае выкананне дзяржзадання. Адказным прадстаўніком вёскі з’яўляўся стараста, які павінен быў абірацца сялянскім сходам большасцю галасоў і зацвярджацца адказным павятовым кіраўніцтвам.

Кожны фермер, які дрэнна веў сваю справу або разглядаўся як палітычна ненадзейны, пазбаўляўся гаспадаркі, і яго замянялі больш годным. Будынкі калгаса заставаліся на месцы да прыняцця спецыяльнага рэгламенту і не падлягалі зносу. Па жаданні складскія памяшканні калгаса маглі быць выкарыстаны ў якасці агульных будынкаў для касы ўзаемадапамогі.

Плаванавалася, што увесь інвентар калгасаў павінен будзе раздацца сялянам, пры гэтым перш за ўсё яго павінны былі атрымаць тыя, хто прынёс у калгас адпаведны інструмент.

У дзень роспуску калгаса, завяршэння бухгалтарскага ўліку, раздачы лішкаў сялянам пасля працоўных дзён сялянства вёскі несла салідарную адказнасць па даўгах.

Кожны фермер, які атрымаў ад калгаса інвентар, уносіў пэўныя сумы ў касу ўзаемадапамогі вёскі, каб фермеры, якія не атрымалі інвентару, маглі набыць яго. Да поўнай выплаты гэтых унёскаў ён быў абавязаны па загаду старасты вёскі [3, арк. 48-49] дапамагаць суседзям у апрацоўцы палёў і г.д., а стараста выдаваў яму пэўны аб'ём кармоў. Падзел калгасных палёў праводзіўся згодна з указаннямі райаграномаў і землямераў, пад наглядам адказнага ўчастковага фермера.

Усе машыны павінны былі перадавацца ў МТС [Там жа, арк. 49]. Царкоўныя землі адводзіліся або ў зямельны запасны фонд, або ў дзяржаўную ўласнасць. Зямля, якая належала школам, заставалася ў іх карыстанні. Існуючыя сядзібы агратэхнікаў таксама падзелу не падлягалі. Меліяраваныя тарфянікі адносіліся да бліжэйшай дзяржаўнай уласнасці. Любы падзел зямельнага фонду забараняўся, а калі ён быў зроблены пасля 22 чэрвеня 1941 года, дык увогуле адмяняўся. Здача зямлі ў арэнду таксама разглядалася як недапушчальная [Там жа, арк. 49].

17 лістапада 1942 г. была выдадзена інструкцыя для службовага карыстання аб кіраванні дзяржаўнай маёмасцю, якая, на думку акупантаў, павінна была садзейнічаць развіццю і кіраванню дзяржаўнай уласнасцю і якая магла быць дапоўнена адмысловымі нарматыўнымі прававымі актамі. Дакумент падзяляўся на некалькі частак: арганізацыя і задачы дзяржаўнай уласнасці. У першай часцы апісваліся агульныя падыходы да кіравання дзяржаўнай маёмасцю. У гаспадарчай групе "Цэнтр", галаўной групе "Сельская гаспадарка", гаспадарчых камандах прызначаліся спецыяльныя чыноўнікі, адказныя за дзяржаўную маёмасць. У выпадку з рэгіянальнымі фермерамі па неабходнасці прызначаліся кіраўнікі гаспадаркі, якія падпарадкоўваліся абласному фермеру і ўваходзілі ў яго штат. Аднак вышэйстаячым органам дзяржаўных маёнткаў, што знаходзяцца ў гэтай мясцовасці, заставаўся павятовы фермер, які адказваў за будаўнічыя мерапрыемствы на дзяржаўных землях.

Планавалася, што кожная дзяржаўная маёмасць павінна быць укамплектавана нямецкім персаналам. На пасады начальнікаў у дзяржаўнай уласнасці ставілі спецыяльна прызначаных асоб ў афіцэрскім званні, паколькі кіраванне дзяржаўнай маёмасцю ў такіх абставінах патрабавала непазбежных перамоваў з ваеннымі ведамствамі. Для буйных гаспадарак і гаспадарак з асаблівымі задачамі маглі быць дэлегаваныя кіраўнікі сельскай гаспадаркі [4, арк. 10б].

Раздзел, прысвечаны задачам дзяржаўнай уласнасці, быў прапісаны больш грунтоўна. Асноўнымі задачамі ўсіх вышэйзгаданых кіраўнікоў абвяшчалася аднаўленне, упарадкаванне тэхніка-эканамічнага становішча дзяржаўнай маёмасці, характэрнага для ўзорнага буйнога сельгаспрадпрыемства. Акрамя таго, памяшканні і рэсурсы, даступныя для выканання спецыяльных задач у асобных кампаніях, павінны былі захоўвацца і пашырацца.

Для вырашэння гэтых задач былі распрацаваны рэкамендацыі, якія датычыліся сельскай гаспадаркі, корманарыхтоўкі, жывёлагадоўлі, выдаленню гною, спецыялізацыі асобных устаноў, кіравання будынкамі, планаў маёнткаў, інвентарызацыі інструментарыя і тэхнікі, бухгалтэрыі, пытанняў кансультацыйнай дапамогі і зімовых павіннасцей дзяржаўных маёмасцей. Прадугледжваўся таксама комплекс работ на зімовы перыяд, які ахопліваў рамонт машын і прылад, выраб простых прыстасаванняў, такіх як граблі, матыкі, кошыкі, драўляныя рыдлёўкі, венікі, вупражы, вяроўкі для сена, выраб мяшкоў, латанне мяшкоў, прадзенне і ткацтва для патрэб прадпрыемства, падтрыманне запасаў насення і кармоў і строгі кантроль за расходам гэтых тавараў у адпаведнасці з планам выкарыстання, унутраны рамонт гаспадарчых пабудоў і кватэр, пастаўкі драўніны і дроў, заключэнне кантрактаў на ўсе віды апертыўных патрэб мясцовым кампаніям, офісную працу: крэдытныя карты, планы, разлікі, бухгалтэрыя [4, арк. 14].

28 кастрычніка 1942 г. галаўной групай "Сельская гаспадарка" быў разасланы цыркуляр, які зацвярджаў "новы аграрны парадак" і прадпісваў ажыццяўленне аграрнай рэформы, па якой прадугледжвалася пераўтварэнне існуючых сельскагаспадарчых аб'яднанняў у сельскагаспадарчыя кааператывы. Для выканання аграрнага парадку ў зоне дзейнасці кожнага армейскага камандвання генеральнай інспекцыі, як і ў выпадку з галоўнай групай, неабходна было неадкладна стварыць асобны сельскагаспадарчы штаб. Кіраваць спецыяльнымі штабамі аграрнага парадку павінен быў прыдатны для гэтага кіраўнік сельскай гаспадаркі. Кіраўнікі спецыяльных штабоў неслі адказнасць за агульнае развіццё аграрных адносін [1, арк. 28–30]. Асобнае распараджэнне начальніка групы гаспадаркі ад 21 лістапада 1942 г. рэгулявала персанальны склад кіраўніцтва абласных і раённых фермерскіх гаспадарак [2, арк. 41b].

*Працоўная штодзённасць сельскага насельніцтва*

Згодна з інфармацыяй крыніц адно з першых распараджэнняў, што датычылася аплаты працы мясцовага сельскага насельніцтва, адносіцца да 3 верасня 1941 г. Яно ўтрымлівала ўказанні для прамежкавага рэгулявання зарплаты работнікаў калгасаў, машына-трактарных станцый і саўгасаў.

Калгаснікі не павінны былі атрымліваць дакладна ўстаноўлены заробак, а выпрацоўваць долю агульнага даходу. У сваю чаргу замежным працоўным і работнікам, якія не з'яўляліся калгаснікамі, а таксама работнікам і працоўным МТС і саўгасаў выплочвалася зарплата. Сцвярджалася: каб забяспечыць атрыманне прадуктаў прыроднага паходжання нямецкімі прыёмнымі пунктамі, раздачу гэтых прадуктаў калгаснікам і адпаведную долю харчавання ў зарплаце, нельга было перавышаць індывідуальныя патрэбнасці атрымальнікаў.

Работнікі калгасаў атрымлівалі ўзнагароду ў адпаведнасці са стаўкамі, сапраўднымі на 22.06.1941 г. (грашовыя сродкі + натураплата). Калі аплата доляй натуральных прадуктаў не прадугледжвалася, атрымальніку заработнай платы дапускалася вылучыць натуральныя прадукты для ўласнага распараджэння (у сям'і) па кошце дастаўкі.

Інструкцыя аб кіраванні дзяржаўнай маёмасцю ад 17 лістапада 1942 г. рэгулявала пытанне занятасці і заработнай платы насельніцтва. Інструкцыяй прадугледжвалася замарожванне заработнай платы служачых і рабочых, занятых у дзяржаўнай уласнасці [4, арк. 14].

Прадугледжвалася дапамога натуральнымі прадуктамі. У далейшым планавалася выдзеліць працаўнікам калгасаў каля 50 % іх заробку ў натуральнай форме. Сцвярджалася, што любое павелічэнне колькасці натуральных прадуктаў, якое перавышала ўзровень харчовай бяспекі для працаўнікоў калгасаў, прывяло б да зніжэння вытворчасці фермы, затрымання будаўнічых работ і, верагодна, да бартэрных здзелак, як лічылі акупацыйныя ўлады. Аднак нямецкае сельскагаспадарчае кіраўніцтва ўжо было гатова забяспечыць неабходны узровень жыцця сельскагаспадарчых работнікаў. Наступныя рэкамендацыі прымяняюцца для выкарыстання прыродных рэсурсаў. Для рабочых у дзяржаўных маёнтках прадугледжваліся бясплатнае жыллё і стайні.

Бульбяная зямля плошчай да 0,25 га і карыстанне агародам, які прымыкае да дамоў, прадастаўляліся з крэдытам у памеры 60 рублёў за га ў год. Лічылася, што бульбяную зямлю апрацоўваць і ўбіраць будуць самі работнікі ўласнымі калектывамі гаспадаркі і, па магчымасці, у вольны час. Неабходнае хлебнае зерне або муку працаўнікі гаспадаркі маглі набыць у адпаведнасці з пражытачнымі паказчыкамі, якія ўстанаўліваліся адказным сельгаспрадпрыемствам для кармлення мірнага насельніцтва. З улікам працы работніка гэты паказчык мог быць перавышаны на 50 г на чалавека ў дзень. На прадпрыемствах, дзеназіраліся цяжкасці з запасамі хлебнага зерня, жыта магло быць заменена на ячмень і грэчку [Там жа, арк. 15].

Рабочыя самі неслі кармавыя выдаткі на хатнюю жывёлу, а работнікі фермы, якія не трымалі буйную рагатую жывёлу, штомесяц маглі атрымліваць ад фермы сродкі на закупку малочных прадуктаў.

Утрыманне каровы або дзвюх коз магло быць дазволена на суму 180 рублёў у год. Для працоўных сем’яў, якія не трымалі кароў, прадугледжвалася выдача 1 л абястлушчанага малака на чалавека ў дзень і 1/2 л малака для дзяцей да 5 гадоў.

Непрацуючыя паўналетнія члены сям’і або тыя, хто працаваў за межамі дзяржаўнай сядзібы, не павінны былі атрымліваць малако. Рэгуляванне ўтрымання птушкі заставалася на меркаванне кіраўніка фермы. Пасля ўборкі капусты і буракоў працаўніку можна было прадаць неабходныя зімовыя запасы. Работы па нарэзцы і вырошчванні агародніны і ўборцы ўраджаю маглі быць узнагароджаны здзелкай [4, арк. 15b].

Інструкцыяй прадугледжваліся ўзнагароды мясцоваму насельніцтву за дадатковую працу ў двары, стайні і ў полі. За звышурочныя і нядзельныя работы, па меркаванню кіраўніка, маглі быць прэміі ў выглядзе грашовых або натуральных падарункаў у невялікіх памерах на чалавека ў дзень, напрыклад, 1 кг гароху, або 1–2 кг садавіны, або 1 літр малака ці забеспячэнне сняданкам касцоў.

Галоўная сельскагаспадарчая група пакідала за сабой права пераглядаць стаўкі заробку і любыя неабходныя новыя правілы.

Сістэма аплаты працы ў калгасах захоўвала элементы савецкай. Ацэначная адзінка – гэта так званы «працадзень», адзінка вымярэння, якая зыходзіла з выпрацоўкі дарослага за каляндарны дзень.

Аб’ёмы выкананай працы кожным паасобку павінны былі запісвацца кіраўніком брыгады і безупынна заносіцца ў яго працоўную кніжку. Перыядычна працоўныя кніжкі прадстаўляліся ў «кантору» ці бухгалтарскае бюро калгаса для далейшага разгляду [5, арк. 2].

За кожны працоўны дзень калгаснік атрымліваў пэўную колькасць прадуктаў харчавання (напрыклад, 3 кг зерня, некалькі кг бульбы, малако і г.д), крыху грошай (30 кап., 50 кап). Падчас сезона ён атрымліваў гэта пераважна авансам з канчатковага разліку. Вынікі залежылі непасрэдна ад ураджая, таму вельмі ваганіся. Да размеркавання траплянa толькі тая частка ураджая, якая заставалася пасля вылічвання наступных паставак прадуктаў харчавання:

1) пастаўка да дзяржавы (за вельмі нізкія цэны);

2) натуральны падатак да дзяржавы;

3) аплата прадуктамі харчавання да МТС для трактараў і другіх прац;

4) аплата прадуктами харчавання кіраўніцтву калгасам, аограномам, настаўнікам і г.д.;

5) стварэнне фондаў запасаў.

Дадатковы даход калгаснік імкнуўся атрымаць у натуральнай форме са сваёй маленькай прыватнай гаспадаркі, таксама з продажу гэтых прадуктаў на свабодным «калгасным рынку» ў горадзе па цэнах, якія былі ў шмат разоў вышэй, чым дзяржаўныя рознічныя цэны. За гэта ён павінен быў плаціць высокі падатак. Увогуле рэальны даход калгасніка, таксама як працоўніка прамысловага прадпрыемства, мог быць трошкі вышэй за пражытачны мінімум у савецкім сэнсе, як гэта адзначана ў нямецкіх крыніцах [5, арк. 3].

Такім чынам, акупацыйныя ўлады надавалі сельскай гаспадарцы выключна важнае значэнне як рэзервы для забеспячэння харчаваннем вермахту і акупацыйных структур. У цэлым была захавана савецкая калгасная сістэма, але дэкларавалася неабходнасць правядзення зямельнай рэформы і пераходу да індывідуальных форм гаспадарання. Матэрыялы нямецкіх трафейных дакументаў даюць уяўленне аб арганізацыі землекарыстання і кіравання сельскай гаспадаркай ва ўмовах акупацыі, аплаце працы сельскага насельніцтва і ўвогуле працоўнай штодзённасці вясковага насельніцтва. Увядзенне ў выніку праведзенага даследавання новага факталагічнага масіву ў гістарычную навуку дазваляе паставіць тэарэтычныя пытанні адносна метадалагічных падыходаў і навуковых схем аналізу акупацыйнага перыяду. Новыя дакументальныя крыніцы вызначаюць задачу неабходнасці дапоўніць існуючыя раней канцэптуальныя погляды на выкарыстанне германскімі акупацыйнымі ўладамі працы мясцовага насельніцтва новымі падыходамі, заснаваным на характарыстыцы паўсядзённых вытворчых узаемаадносін на акупаваных беларускіх тэрыторыях. На падставе ўведзеных ў навуковы зварот крыніц, а таксама сучасных мета-далагічных падыходаў варта звярнуцца да аналізу стратэгій выжывання насельніцтва ва ўмовах акупацыі.

ЛІТАРАТУРА

1. Хозяйственный руководитель при Главном военном командовании группы армий «Центр», г. Минск // Архівы Беларусі [Электронны рэсурс]. – 2022. – Рэжым доступу : https://fk.archives.gov.by/fond/11312/. – Дата доступу : 20.03.2022.
2. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 412. Воп. 1. Спр. 2.
3. НАРБ. – Ф. 412. Воп. 1. Спр. 6.
4. НАРБ. – Ф. 412. Воп. 1. Спр. 9.
5. НАРБ. – Ф. 412. Воп. 1. Спр. 4.

*Поступила в редакцию 24.05.2022*